Ба 24972

Статут Таварыства...

Ба 24972

# СТАТУТ
## Т-ВА
# БЕЛАРУСАЎ-ВЫБАРШЧЫКАЎ
### У ДЗЯРЖАЎНЫ СОЙМ, ГАРАЦКІЯ, ПАВЯТОВЫЯ І ВАЛАСНЫЯ САМАЎРАДЫ Ў ЛАТВІІ.

БА 24972

БССР Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

Рыга, 1925.

Выданьне Т-ва Беларусаў-Выбаршчыкаў

25 01 2009

Iekšlietu ministrijas apliecība no 20. maija 1925. g. zem Nr. 217653: Politiskās partijas „Latvijas Saeimas, pilsētu, apriņķu un pagastu pašvaldību baltkrievu vēlētāju Biedrība iesniedza Iekšlietu ministrijai minētās partijas statutus un programu, kuŗi saskaņā ar likumu par biedrībām, savienībām un politiskām organizācijām 26. pantu ievesti politisko organizāciju sarakstā.!

„Valdības Vēstnesis“ 1925. g. Nr.

# СТАТУТ

## ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСАЎ-ВЫБАРШЧЫКАЎ У ДЗЯРЖАЎНЫ СОЙМ, ГАРАЦКІЯ, ПАВЯТОВЫЯ І ВАЛАСНЫЯ САМАЎРАДЫ Ў ЛАТВІІ.

### Мэты Таварыства, район дзеяльнасьці, правы і абавязкі.

§ 1. Назва Таварыства: „Latvijas Saeimas, pilsētu, apriņķu un pagastu pašvaldību baltkrievu vēlētāju biedrība“ („Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, гарацкія, павятовыя і валасныя самаўрады ў Латвіі“).

§ 2. Мэты Таварыства:

З поваду таго, што беларуская нацыянальная меншасьць у Латвіі дае найбольшы працэнт неграматных сялян і рабочых выбаршчыкаў, якія дужа часта — па сваёй несьвядомасьці, неарганізаванасьці, неграматнасьці і адсутнасьці добра нарыхтаванае інфармацыі — ня толькі зусім па выпадковым пабуджджэньням галасуюць за той ці іншы спісак, але нават і зусім адхіляюцца ад удзелу ў выбарах, — Таварыства ставіць сабе мэтай аб'яднаць беларусаў выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, у гарацкія, павятовыя і валасныя самаўрады, каб даць беларускай меншасьці магчымасьць папярэдняга абмену думак, абгаварываньня сваіх эканамічна-сацыяльных і

нацыянальна-культурных патрэбаў, выстаўленьня адпаведных беларускіх кандыдатур у Дзяржаўны Сойм, у гарацкія, у павятовыя і валасныя самаўрады, а так сама і ў рожныя камісыі і камітэты, па падрыхтоўке і правядзеньню памяненых выбараў.

§ 3. Дзеля здзейсьненьня гэтых мэтаў Таварыства:

а) робіць публічныя і зачыненыя даклады, лекцыі, сходы, дыспуты,

б) зьбірае кангрэссы, зьезды і нарады;

в) друкуе газэты, штомесячнікі, адозвы, праграмы, інструкцыі, агляды і т. п.;

г) выстаўляе, ў законам прадугледжаным парадку, сьпіскі сваіх кандыдатаў у Сойм, гарацкія, павятовыя і валасныя самаўрады;

д) дэлегуе сваіх прадстаўнікоў для удзелу ў працы рожных камісыяў і камітэтаў па выбарах;

е) арганізуе вечарыны, прагулкі, маёўкі, шэствія, выезды ў зелень, спэктаклі, латарэі, экскурсыі, курсы, кіно, бібліатэкі, спартыўныя сэкцыі, драматычныя гурткі, хоры, навуковыя і музыкальныя кружкі.

§ 4. Таварыства мае права юрыдычнае асобы (ліца) і, як гэткае, мае права на здабыцьцё нярухомае і рухомае маёмасьці, паісківаць і адказываць перад судам.

§ 5. Таварыства мае права адчыняць свае філіяльныя адзельньні.

§ 6. Таварыства вядзе сваю працу па ўсёй Латвіі.

§ 7. Таварыства мае сваю пячатку і углавы штамп з поўнай назовай Таварыства. Гэткую ж пячатку і штамп маюць і ўсе Аддзяленьні Таварыства з дадаткам да назовы Т-ва назовы даннага адзяленьня.

## II. Склад Таварыства.

§ 8. Члены Таварыства падзяляюцца на: а) спачуваючых, б) актыўных і в) ганаровых.

§ 9. а) Членамі-спачуваючымі могуць быць асобы беларускае нацыянальнасьці абодвых полаў, узростам не маладзей 18 гадоў, спачуваючыя мэтам таварыства, але ня маючыя права на удзел у выбарах.

б) Актыўнымі членамі Таварыства могуць быць асобы беларускае нацыянальнасьці абодвых полаў, бяз рожніцы вераспавяданьняў, не абмежаваныя ў правох па суду і маючыя згодна закону права удзелу ў выбарах.

в) Ганаровымі членамі Таварыства могуць быць асобы, зрабіўшыя асобныя заслугі перад Таварыствам.

§ 10. Новыя члены, за выняткам ганаровых членаў, якія выбіраюцца агульнымі сходамі, прыймаюцца Праўленьнямі філіяльных Аддзяленьняў Таварыства, а зацьвярджаюцца Цэнтральным праўленьнем Таварыства, якое знаходзіцца ў Рызе.

Калі філіяльнае адзяленьне з якіх колечы повадаў адмаўляецца прыняць паказаную ў § 8-мым пад літарамі „а“ і „б“ асобу, апошняя можа зьвярнуцца да Цэнтральнага праўленьня, а затым і да зьезду дэлегатаў Таварыства, пастанова якога ў гэтай справе лічыцца аканчальнай.

§ 11. Член лічыцца выбыўшым з Таварыства:

а) калі ён самахвоць выступае з Таварыства, паведаміўшы аб гэтым праўленьне пісьменнай заявай;
б) калі ў бягучым годзе ён не заплаціў членскага ўзносу;
в) калі зьездам дэлегатаў Таварыства ён выключаны з ліку членаў за шкодную працу і учынкі адносна Таварыства.

Для выключэньня члена пастанова павінна быць прынята $^2/_3$ галасоў, прысутных на зьездзе дэлегатаў.

## III. Сродкі Таварыства.

§ 12. Сродкі Таварыства складаюцца:

а) з гадавых і ўступных членскіх ўзносаў,
б) з ахфяраў,
в) са збораў ад рожных вечарынаў і іншых начынаньняў Т-ва,
г) з дапамог ад рожных беларускіх арганізацыяў.

§ 13. Кожны актыўны член Таварыства пры ўступленьні плаціць у касу свайго Аддзяленьня аднаразовы ўступны ўзнос і штогодна гадавы членскі ўзнос, велічыню каторых устанаўляе зьезд дэлегатаў.

§ 14. Члены, якія адразу ўносюць больш за 50 латаў, звальняюцца на заўсёды ад гадавых членскіх ўзносаў.

§ 15. Адчотны год працы Таварыства лічыцца з 1 студзеня і канчаецца 31 сьнежаня.

## IV. Кіраўніцтва Таварыства.

§ 16. Працу Таварыства ўстанаўляюць і ім кіруюць:

а) Зьезд дэлегатаў Таварыства,
б) Цэнтральнае Праўленьне Таварыства,
в) Агульныя Сходы членаў Аддзяленьняў Таварыства,
г) Праўленьня Аддзяленьняў Таварыства,
д) Цэнтральная Рэвізыйная камісыя Таварыства,
е) Рэвізыйныя камісіі Аддзяленьняў Таварыства.

## Зьезд дэлегатаў.

§ 17. Зьезды дэлегатаў адбываюцца чарговыя і надзвычайныя.

Чарговы зьезд дэлегатаў склікае Цэнтральнае праўленьне Таварыства раз у год, і не пазьней красавіка (апрэля) месяца.

Надзвычайны зьезд дэлегатаў склікае Цэнтральнае Праўленьне Таварыства па сваёй ініцыятыве, па ініціатыве Цэнтральнай рэвізыйнай камісіі, па просьбе $^1/_{10}$ агульнага ліку Праўленьняў Аддзяленьняў Таварыства, ці $^1/_{10}$ агульнага ліку Рэвізыйных камісіяў Аддзяленьняў Таварыства, па просьбе $^1/_{10}$ агульнага ліку выбраных на гэты год дэлегатаў, нарэшце па затрэбаваньню $^1/_{10}$ агульнага ліку ўсіх членаў Таварыства.

Ініцыятары скліканьня надзвычайнага зьезду дэлегатаў абавязаны указаць пункты павесткі дня, склікаемага імі зьезду дэлегатаў.

Аб чарговых і надзвычайных Зьездах дэлегатаў публікуецца за тыдзень у органах друку, устаноўленых Зьездам дэлегатаў, ды апрача таго ў Праўленьне кожнага Аддзяленьня Таварыства пасылаецца не пазьней, як за тыдзень да зьезду дэлегатаў, праз Цэнтральнае Праўленьне, паведамленьне аб маючым адбыцца Зьезду дэлегатаў і павесткі дэлегатам.

§ 18. Дэлегаты на Зьезды Дэлегатаў Таварыства выбіраюцца штогодна на гадавых чарговых Агульных Сходах Аддзяленьняў Таварыства срокам на адзін год, прапарцыянальна ліку членаў кожнага аддзяленьня і з гэткай разрахубай, каб ад кожнага аддзяленьня Т-ва была выбрана ня менш аднаго дэлегата і ня больш, як па аднаму дэлегату ад кожных 10 членаў Аддзяленьня.

У лік дэлегатаў на Зьезд Дэлегатаў могуць быць выбіраемы так сама і тыя асобы, што выбраны ў склад Праўленьняў і Рэвізыйных Камісіяў сваіх Адзяленьняў.

§ 19. Зьезд Дэлегатаў таварыства:

а) абгаварывае, разглядае і прыймае гадавыя справаздачы, буджэты і праэкты, зложаныя Цэнтральным Праўленьнем;
б) зацьверджае набываньне і страту маёмасьці;
в) зьмяняе статут;
г) выключае членаў, што працуюць у кірунку, шкодным для Таварыства;
д) выбірае Цэнтральнае Праўленьне Таварыства, Цэнтральную рэвізыйную Камісыю і іншыя патрэбныя камісыі;
е) зацьверджае інструкцыі Праўленьню, Рэвізыйнай і іншым камісыям, гурткам і сэкцыям.

§ 20. Усе пытаньні, за выключэньнем зьмены статуту і выключэньня членаў, Зьезд Дэлегатаў вырашае простаю большасьцю галасоў. Выбары дэлегатаў, членаў праўленьня і рэвізыйнае камісіі робюцца зачыненым галасаваньнем.

§ 21. Зьмены статуту і выключэньне членаў, што працуюць на шкоду інтэрэсам Таварыства, або кампрамэтуюць яго сваім трыманьнем, патрабуюць $^2/_3$ галасоў усіх прысутных дэлегатаў.

§ 22. Зьезд Дэлегатаў можа рабіць пастановы, калі на ім прысутны ня менш паловы выбраных Аддзяленьнямі на данны год дэлегатаў. Калі першы Зьезд дэлегатаў не паўнамоцны, дык не раней як праз 14 дзён склікаецца новы зьезд дэлегатаў, які правамоцны выносіць пастановы пры ўсякім ліку дэлегатаў.

## Цэнтральнае Праўленьне.

§ 23. Цэнтральнае Праўленьне складаецца з 5 членаў і 3 (трох) кандыдатаў да іх. Цэнтральнае Праўленьне выбіраецца чарговым зьездам дэлегатаў на адзін год.

Ў Праўленьне могуць быць выбіраемы толькі паўнапраўныя асобы.

§ 24. Заданьні Цэнтральнага Праўленьня:

а) зьдзейсьненьне мэтаў, паказаных у статуце, асноўваючыся на пастановах Зьезду дэлегатаў;
б) кіраваньне капіталамі, рэчыма і маёмасьцю Таварыства;
в) укладаньне справаздачаў, буджэту, перагляд прапазыцыяў аддзяленьняў і паасобных членаў Таварыства, разпрацоўка пытаньняў, падлягаючых разгляду на Зьездах дэлегатаў Т-ва і на Агульных Сходах ягоных аддзяленьняў;
г) рэпрэзэнтацыя Таварыства;
д) апрацоўка інструкцыяў органам кіраўніцтва Таварыства і яго аддзяленьняў і кіраваньне імі;
е) прыём і звальненьне платных працаўнікоў Таварыства;
ж) клопат аб памешканьню Таварыства.

§ 25. Цэнтральнае Праўленьне выбірае са свайго складу Старшыню, ягонага Намесьніка, Сэкрэтара і Скарбніка, ды падзяляе паміж сабой бягучую працу праўленьня.

§ 26. Сходы Цэнтральнага Праўленьня паўнамоцны, калі на іх прысутна палова, г. ё. 3 члены Цэнтральнага Праўленьня.

Сходы Цэнтральнага Праўленьня склікае і кіруе імі Старшыня, або ягоны намесьнік; калі ж яны не зьявіліся, дык сход вядзе хто колечы з членаў па агульнай згодзе.

§ 27. Усе пытаньні Цэнтральнае Праўленьне вырашае звычайнай большасьцю галасоў.

§ 28. Цэнтральнае Праўленьне мае права запрашаць на свае сходы кампэтэнтных асобаў з правам дарадчага голасу.

§ 29. Выбываючыя паперы Цэнтральнага Праўленьня падпісывае старшыня, або ягоны намесьнік, і сэкрэтар ці скарбнік, гледзючы па зьместу паперы.

§ 30. Цэнтральнае Праўленьне Таварыства знаходзіцца ў г. Рызе.

## Агулныя Сходы Аддзяленьнеў Таварыства.

§ 31. Агульныя Сходы Аддзяленьнеў Таварыства адбываюцца чарговыя і надзвычайныя.

Чарговы Агульны сход склікае Праўленьне даннага Аддзяленьня Таварыства раз у год і не пазьней сакавіка (марта) месяца.

Надзвычайныя Агульныя сходы Аддзяленьнеў склікае Праўленьне даннага Аддзяленьня Таварыства па сваёй ініцыятыве, па загаду Цэнтральнага Праўленьня, па ініцыятыве Цэнтральнае Рэвізыйнае Камісьі, па ініцыятыве Рэвізыйнае Камісьі даннага Аддзяленьня Таварыства і па патрэбаваньню $^1/_{10}$ часьці членаў даннага Аддзяленьня. Ініцыатары надзвычайнага агульнага сходу павінны указаць парадак дня, склікаючы сход.

Не пазьней, як за тыдзень да чарговых і надзвычайных Агульных Сходаў сябры аддзяленьнеў запрашаюцца на сход павесткамі і публікацыямі ў паказаных Агульным Сходам органах друку.

§ 32. Агульныя Сходы Аддзяленьнеў:

а) Разглядаюць і прыймаюць штогодныя справаздачы, буджэты, праэкты, зложаныя Праўленьнем Аддзяленьня;

б) Зацьвярджаюць здабытак і страту маёмасьці даннага Аддзяленьня;

в) Выбіраюць Праўленьне Аддзяленьня, дэлегатаў ад Аддзяленьня на Зьезд дэлегатаў Таварыства, рэвізыйную камісыю Аддзяленьня і іншыя камісыі;

г) Разглядаюць пытаньні, але ня выносюць самі аканчальнае пастановы, аб зьменах статуту, аб выключэньні членаў, шкодных Таварыству, і аб інструкцыях Праўленьню, Рэвізыйнай камісыі і іншым камісыям і гурткам; аканчальнае слова ў гэтых пытаньнях належыць Зьезду Дэлегатаў Таварыства.

§ 33. Усе пытаньні, за выключеньнем зьмены статуту, і выключэньня членаў, Агульны Сход Аддзяленьня вырашае простай большасьцю галасоў.

§ 34. Постановы аб зьмене статуту і выключэньні членаў, працуючых на шкоду Таварыству, або кампраментуючых яго сваім трыманьнем, патрабаюць $^2/_3$ галасоў усіх прысутных на сходзе і маюць сілу толькі пасьля зацьверджаньня гэтых пастаноў Зьездам Дэлегатаў.

§ 35. Агульны Сход Аддзяленьня можа рабіць паўнапраўныя пастановы, калі на сходзе прысутна ня менш паловы членаў Аддзяленьня. Калі першы Сход не паўнапраўны, дык не раней 14 дзен зьбіраецца другі сход, які лічыцца паўнапраўным пры ўсякім ліку членаў.

## Праўленьні Аддзяленьнеў Таварыства.

§ 36. Праўленьні Аддзяленьнеў Таварыства складаюцца з 5 членаў і трох (3) кандыдатаў. Праўленьне Аддзяленьня выбіраецца патаемным галасаваньнем на чарговым Агульным Сходзе членаў Аддзяленьня, простай большасьцю галасоў, тэрмінам на адзін год. У Праўленьне могуць быць выбраны толькі паўнапраўныя асобы.

§ 37. Праўленьні Аддзяленьнеў, як і агульныя Сходы Аддзяленьнеў, ня маюць права выступаць і вынасіць пастановы ад імя ўсяго Таварыства.

§ 38. Заданьні Праўленьня Аддзяленьня, канструкцыя яго і парадак тыя працы ж, што фармуліраваны у §§ 24, 25, 26, 27, 28 і 29 для Цэнтальнага Праўленьня, з тэй агаворкаю, што компэтэнцыя Праўленьня Аддзяленьня пашырана толькі на працу даннага Аддзяленьня.

## Аддзяленьне Т-ва.

§ 39. Каб адчыніць новае Аддзяленьне Таварыства патрэбна заява ў Цэнтральнае Праўленьне, зложаная на пісьме і падпісаная ня менш як 10 членамі Таварыства. Цэнтральнае Праўленьне разглядае заяву і, калі знойдзе патрэбным, дае згоду на адчыненьне Аддзела.

§ 40. Праўленьні Аддзяленьнеў прядстаўляюць у Цэнтральнае Праўленьне сьпіскі сваіх членаў, сьпіскі членаў Праўленьня, Рэвізыйнае і іншых камісыяў.

§ 41. 20% ўсіх збораў з членаў Аддзяленьня і начынаньнеў яго паступаюць у Касу Цэнтральнага Праўленьня Таварыства.

§ 42. Пячатку і штамп Аддзяленьня выдае Цэнтральнае Праўленьне.

## Цэнтральная Рэвізыйная Камісыя.

§ 43. Цэнтральная Рэвізыйная Камісыя Таварыства выбіраецца чарговым зьездам дэлегатаў, тэрмінам на адзін год.

§ 44. Рэвізыйная Камісыя складаецца з 3 членаў і 2 кандыдатаў да іх.

§ 45. Абавязак Рэвізыйнае Камісыі кантраляваць ва ўсякі момант грашовыя сумы Таварыства, маёмасьць і кнігі. Яна разглядае буджэт Таварыства, гадавыя справаздачы і дае Зьезду Дэлегатаў свае пастановы аб іх і аб працы Праўленьня наагул. Аб сваей працы Рэвізыйная Камісыя паведамляе Зьезд Дэлегатаў. Сходы Рэвізыйнае Камісыі склікае яе Старшыня, паведаміўшы аб гэтым пісьменна за 3 дні. Свае пастановы Рэвізыйная Камісыя прыймае звычайнай большасьцю галасоў.

§ 46. Цэнтральная Рэвізыйная Камісыя можа рэвізаваць і Аддзелы Таварыства.

## Рэвізыйныя Камісыі Аддзяленьнеў.

§ 47. Рэвізыйная Камісыя Аддзяленьня Т-ва выбіраецца Чарговым Агульным Сходам даннага Аддзяленьня.

§ 48. Складаецца і працуе Рэвізыйная Камісыя Аддзяленьня на тых жа прынцыпах, што паказаны у § 44 і 45 для Цэнтральнае Рэвізыйнае Камісыі, але праца Рэвізыйнае Камісыі Аддзяленьня адбываецца толькі ў межах свайго Аддзяленьня.

Пачатак працы Таварыства.

§ 49. Пасьля рэгістрацыі статуту і да скліканьня Першага Чарговага Зьезду Дэлегатаў Т-ва, вядуць працу і часова спаўняюць абавязкі Цэнтральнага Праўленьня закладчыкі — ініцыатары Т-ва, падпісаўшыя гэты статут. У гэтых мэтах ініцыатары-закладчыкі са свайго складу выбіраюць Часовае Цэнтральнае Праўленьне.

§ 50. Першы Зьезд Дэлегатаў зьбіраецца пасьля таго, як адчыняецца ня меньш трох Аддзяленьнеў.

§ 51. Усе ініцыатары-закладчыкі прыймаюць удзел у першым Зьездзе Дэлегатаў на роўных з дэлегатамі правох.

## VI. Ліквідацыя Таварыства.

§ 52. Таварыства ліквідуецца:

а) па пастанове Зьезду Дэлегатаў,

б) калі лік членаў Таварыства будзе менш пяці,

в) калі Таварыства будзе абвешчана неплацежаздольным.

§ 53. Калі зьяўляюцца абставіны, каторыя даюць грунт паднімаць пытаньне аб яго ліквідацыі, — абавязак Цэнтральнага Праўленьня зараз жа склікаць Зьезд Дэлегатаў, дзе пастанаўляецца аб ліквідацыі Таварыства, або аб пазбаўленьні тых варункаў, што выклікаюць ліквідацыю.

§ 54. У выпадку ліквідацыі Таварыства, ліквідацыю робіць Праўленьне, калі Зьезд Дэлегатаў не даручае гэтага спэцыяльна выбраным ліквідатарам, лікам ня менш 3. Пастанова Зьезду Дэлегатаў аб ліквідацыі абвяшчаецца Міністэрству Унутраных Спраў, публікуецца ў аднэй з мяйсцовых газэт і ў „Урадовым Вестніку“ („Valdības Vēstnesis“).

§ 55. Ліквідатары паведамляюць павесткамі і абвесткамі крэдытораў Т-ва, адшуківаюць сродкі на задаваленьне іх патрабаваньнеў, прадаюць маёмасьць Т-ва, вядуць перагаворы і заключаюць кантракты з трэцьцімі асобамі і установамі, па пастановам Зьезду Дэлегатаў.

§ 56. Грашовыя сумы, адлічываючы належную суму выдаткаў, можна выплаціць членам толькі пасьля уплаты ўсіх даўгоў Т-ва і пасьля зацьверджаньня на Зьездзе Дэлегатаў справаздачы аб ліквідацыі, і ні ў якім разе не раней, як праз год пасьля абвешчаньня ліквідацыі. Абавязак ліквідатараў затрымаць тую суму, патрэбнасьць якой пад пытаньнем, а таксама і на пагашэньне тых пазычак, срокі якіх яшчэ не падыйшлі.

§ 57. Пасьля сканчэньня ліквідацыі, ліквідатары робюць справаздачу аб сваёй дзеяльнасьці, якую разам з одзывам Цэнтральнае Рэвізыйнае

Камісыі прадстаўляюць на разгляд і зацьверджаньне Зьезду Дэлегатаў. Пасьля зацьверджаньня справаздачы аб сканчэньню ліквідацыі, ліквідатары паведамляюць Міністэрства Унутраных Спраў. Кнігі Т-ва, паперы і дакумэнты ліквідатары передаюць на сховы ў тое-жа Міністэрства.

БА 24972

A. Krēsliņa grāmatu spiestuve, Rīgā, Blaumaņa ielā 3.

1964 – №

Бел. аддзел
1994 г.

B0000002735567